РАЗАМ СПАСЦІГНЕМ ГЛЫБІНІ СУСВЕТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах кіраўніка дзяржавы, касмічная галіна нашай краіны ўпэўнена развіваецца. Беларусь паспяхова выпускае аптычныя сістэмы высокай разрознасці для спадарожнікаў, касмічныя люстэркі з асаблівай гладкасцю, апаратуру для дыстанцыйнага зандзіравання. Сумесна з расійскімі калегамі айчынныя спецыялісты распрацоўваюць перспектыўныя тэхналогіі, прымаюць удзел у праекце стварэння новага касмічнага апарата, плануюць супрацоўніцтва ў рамках міжнароднай праграмы «Сірыус».

Таксама беларускі лідар нагадаў, што Беларусь з'яўляецца паўнапраўным і актыўным удзельнікам Камітэта ААН па выкарыстанні пазаземнай прасторы дзеля мірных мэт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, усё вышэйназванае адбывалася не проста на яго вачах — яму даводзілася прымаць рашэнні па развіцці касмічнай галіны ў Беларусі. Ён адзначыў, што калі б не было беларускіх касманаўтаў, наўрад ці ў нашай краіне ўзяліся б за гэтую тэму. «Сёння мы не шкадуем. Шмат было супраціўлення, размоў, гэта новая была тэма для Беларусі, але тым не менш мною былі прыняты рашэнні, перш за ўсё таму, што гэта самыя новыя тэхналогіі — найноўшыя тэхналогіі, якія пацягнулі за сабой цэлы сектар эканомікі. Гэта спрыяе ўздыму Беларусі на больш высокі ўзровень. Гэта спрыяе таму, што Беларусь стала ў шэраг высокаразвітых цывілізаваных дзяржаў, дзе развіваюцца атамная энергетыка, касманаўтыка, іншыя кірункі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што сёння ўвесь свет аб'ядноўвае свае намаганні ў засваенні космасу. На думку Аляксандра Лукашэнкі, гэта і з'яўляецца рухаючай сілай навукова-тэхнічнага прагрэсу. Сумесная праца вучоных, інжынераў, тэхнікаў, безумоўна, спрыяе развіццю і іншых сфер, росту нацыянальных эканомік.

«Яскравы прыклад эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне асваення космасу — гэта Міжнародная касмічная станцыя», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што запуск першага модуля адбыўся 20 гадоў таму. Ужо тады ў распрацоўцы і зборцы станцыі ўдзельнічалі 15 краін, цяпер яе магчымасці выкарыстоўваюць у сваіх мэтах сто дзяржаў. На яе борце паспяхова і плённа працуюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. «Гэта арбітальная лабараторыя — узор таго, як у сучасным свеце можна і трэба выбудоўваць партнёрскія і дзелавыя адносіны паміж дзяржавамі і народамі, якія насяляюць планету. Калі хочаце — гэта яркі прыклад нам, зямлянам, як трэба жыць у гэтым цесным свеце, які хутка развіваецца, жыць у міры і згодзе на карысць усіх народаў. На жаль, мы не заўсёды, а то і часцяком гэтым прыкладам не карыстаемся. У нас на Зямлі часта адбываецца ўсё наадварот, — дадаў беларускі лідар. — Такім жа высакародным мэтам служыць Міжнародны альянс аператараў штучных спадарожнікаў Зямлі «ПанГеа». На сувязі з ім знаходзіцца і беларускі апарат «Белінтэрсат-1».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: важна ўсе дасягненні і назапашаныя ў касмічнай галіне веды накіроўваць на карысць для людзей, а таксама на вырашэнне праблем экалогіі, папярэджанне надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару. На гарантаванне харчовай бяспекі і рацыянальнага землекарыстання. На захаванне прыродных рэсурсаў і біялагічнай разнастайнасці, на вывучэнне пазаземнай прасторы выключна з мірнымі мэтамі.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што трэба будзе вырашыць шмат задач далейшага асваення космасу. На парадку дня — новыя палёты чалавека на Месяц, пілатаванне караблёў на Марс, пошук і даследаванне іншых прыдатных для жыцця планет.

«Каму, як не вам, удзельнікам касмічных экспедыцый, ведаць, што толькі з лініі арбіты можна ўбачыць, якая маленькая і крохкая наша планета ў маштабах Сусвету. Толькі зірнуўшы ў ілюмінатар, можна зразумець, што яна — наш агульны дом, клопат пра які — на плячах усёй сучаснай цывілізацыі, кожнага чалавека, — адзначыў беларускі лідар, звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму. — Там, на вышыні сотняў кіламетраў, асабліва зразумела, што мы ўсе — дзеці Зямлі, адна сям'я. І ў адказе за будучыню гэтага кавалачка Сусвету».

На яго думку, менавіта разам, у цесным супрацоўніцтве, мы наблізімся да новых значных вех асваення космасу. «Толькі ў інтарэсах усяго свету, давяраючы адно аднаму, мы павінны будаваць нашу касмічную будучыню. Беларусь гатовая да дыялогу, актыўнага ўдзелу ў мірных праграмах і праектах, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы рады таму, што трыццаць першы Міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў праходзіць у нашай сталіцы — горадзе-героі Мінску!»

Кіраўнік дзяржавы пажадаў удзельнікам плённай працы, цікавых сустрэч і добрых уражанняў аб нашай краіне і гасцінным народзе, а нашай планеце — міру, дабра і росквіту.

На памяць Прэзідэнту падарылі карціну, якую намаляваў Аляксей Лявонаў. Аляксандр Лукашэнка папрасіў, каб, перш чым гэты твор мастацтва адправяць у Палац Незалежнасці, ён быў у «Белэкспа» і нагадваў, што славуты касманаўт, які не змог прыехаць на кангрэс, — побач з яго ўдзельнікамі. Кіраўнік дзяржавы назваў карціну неацэннай.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

У тэму

Як адзначыў у кулуарах кангрэса лётчык-касманаўт СССР, ураджэнец Беларусі Пётр Клімук, Беларусь — краіна перадавая. «Касманаўты, якія прыехалі сюды, дзівяцца. Такая чысціня, так усё прыемна тут, і так сустракаюць добра», — дадаў ён.

Што чакае касмічную сферу? На гэтае пытанне Пётр Клімук адказаў, што за ёй — будучыня. «Чалавек заўсёды імкнецца да новага. А касманаўтыка — гэта новае. Можа быць, мы яшчэ цывілізацыю якую-небудзь новую ўбачым, на планеце новай пабываем. Таму што ўсё развіваецца. Толькі паглядзіце, як на планеце за невялікі прамежак часу пайшоў наперад навукова-тэхнічны прагрэс», — сказаў наш славуты зямляк.

Лётчык-касманаўт, ураджэнец Беларусі Алег Навіцкі расказаў журналістам, што разлічвае адправіцца ў новы палёт у 2020 годзе. Ён адзначыў той факт, што не кожная краіна ўдастойвалася гонару прымаць падобнае маштабнае мерапрыемства. На яго думку, гэта нармальны дыялог роўных партнёраў. «Свет людзей, якія выконваюць палёты ў космас, не вельмі вялікі для нашай планеты. Таму кангрэс у першую чаргу дае магчымасць пагутарыць з калегамі, паважанымі ветэранамі», — дадаў ён.

Член экіпажа Міжнароднай касмічнай станцыі — бортінжынер Алег Арцем'еў павітаў удзельнікаў кангрэса з космасу і асабліва падкрэсліў свае сваяцкія сувязі з Беларуссю. «Мой бацька нарадзіўся ў пасёлку Друя Віцебскай вобласці, і цяпер разам з маёй мамай яны пражываюць у горадзе Віцебску. Жонка мая таксама нарадзілася ў Беларусі ў горадзе Баранавічы. Вас нідзе так не прымуць, як у Беларусі. Дабрэйшага народа і краіны на свеце няма», — сказаў ён.

Паводле БелТА.

СТАЦЬ СПАРТЫЎНАЙ КРАІНАЙ

Мы маем усе шанцы, а кіраўніцтва дзяржавы падае прыклад

Ёсць пэўная асаблівасць у Дня горада Мінска, і асаблівасць гэта становіцца традыцыяй — фізкультурна-спартыўнае свята, якое можна назваць народным. Бо любы ахвотны можа ўзяць у ім удзел: і малыя дзеці, і тыя, хто прыйшоў проста паглядзець, і спартсмены, і студэнты, і дзяржаўныя служачыя.

Дарэчы, менавіта студэнты і дзяржаўныя служачыя задалі тон, бо ўдзельнічалі ў эстафетных гонках на лыжаролерах і ролікавых каньках, з гэтых эстафет і пачаўся Дзень Мінска — 2018.

Першымі стартавалі студэнты, але яшчэ за паўгадзіны да старту да невялікай групы спартсменаў падышоў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Трошкі пазней высветлілася, што алімпійская чэмпіёнка Надзея Скардзіна і канькабежцы Марына Зуева і Ігнат Галавацюк, з якімі ён гутарыў, складалі разам з лідарам краіны каманду, якая выступала ад Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Потым Аляксандр Лукашэнка праехаўся па спартыўнай трасе разам з Надзеяй Скардзіна — у якасці размінкі. Яшчэ пазней ён гэтак жа размяўся з малодшым сынам. І напэўна, гэта было найлепшым піярам святочных спаборніцтваў. Усе, хто прыйшоў на Дзень горада, маглі ўбачыць лідара краіны зусім побач, многія здымалі кіраўніка дзяржавы на камеры сваіх смартфонаў.

Фота БелТА.

Наперадзе — Надзея СКАРДЗІНА.

Эстафета такое ўражанне толькі ўзмацніла. Але па парадку. Даўжыня трасы, якая праходзіла па праспекце Пераможцаў (рух аўтамабіляў па гарадской магістралі быў перакрыты), склала два кіламетры восемсот метраў. Гэту трасу павінен быў прайсці па чарзе кожны з чатырох удзельнікаў каманды. У склад кожнай каманды ўваходзілі дзве жанчыны і два мужчыны.

Стартавалі і фінішавалі спартсмены каля Палаца спорту, разварот рабілі каля перакрыжавання з вуліцай Гвардзейскай. Спачатку спаборнічалі паміж сабой студэнты вышэйшых навучальных устаноў і каманда аматараў. Дарэчы, у складзе апошняй выступіў самы юны ўдзельнік гонкі — вучань 8 класа Астрашыцкай школы Мікалай Лукашэнка. Трэба сказаць, што малады чалавек паказаў сябе досыць тэхнічным і хуткім бегуном.

Выйграла спаборніцтва паміж ВНУ каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, на другую прыступку п'едэстала падняліся студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, бронзавыя медалі заваявалі студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Узнагароджванне маладых людзей праводзіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава.

У другой гонцы ўдзельнічалі 11 камандаў, у кожнай па чатыры чалавекі. Пры аб'яўленні складаў і стала вядома, што Нацыянальны алімпійскі камітэт прадставяць Надзея Скардзіна, Марына Зуева, Ігнат Галавацюк і Прэзідэнт НАК — Аляксандр Лукашэнка. З імі спаборнічалі каманды, якія прадстаўлялі Камітэт дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўны пагранічны камітэт, Дзяржаўны мытны камітэт, міністэрствы адукацыі, спорту і турызму, унутраных спраў, аховы здароўя, абароны. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выставіла дзве каманды.

Трэба сказаць, што пасля першага этапу лідзіравала каманда Камітэта дзяржаўнай бяспекі, другім перадаў эстафету прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў, трэцяй стала Надзея Скардзіна. Але ўжо на другім этапе Марына Зуева вывела каманду Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў лідары, а Ігнат Галавацюк і Аляксандр Лукашэнка замацавалі перамогу. Прэзідэнт фінішаваў у лыжаролернай гонцы сярод камандаў сілавых ведамстваў і органаў дзяржаўнага кіравання першым.

Другой на фініш прыйшла каманда Камітэта дзяржаўнай бяспекі, трэцім завершыў гонку міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. І менавіта ўдзел кіраўніка міністэрства вывеў яго каманду на другое месца, бо такія былі правілы спаборніцтваў.

У выніку мэр Мінска Андрэй Шорац уручыў залатыя медалі камандзе Нацыянальнага алімпійскага камітэта, сярэбраныя — камандзе Міністэрства спорту і турызму, бронзавыя — камандзе Камітэта дзяржбяспекі.

Потым былі фотасесіі, абмен уражаннямі, віншаванні. Свята прадоўжылася масавым стартам. Адначасова на розных пляцоўках адбываліся іншыя спаборніцтвы. Мінск у гэты дзень не проста гуляў, Мінск у гэты дзень займаўся спортам — весела, па-фестывальнаму.

А эстафета паказала, што ў нашай краіне трэба не толькі ўмець кіраваць, быць прафесіяналам сваёй справы, чалавекам па-добраму амбіцыйным, але і знаходзіцца ў добрай спартыўнай форме. І датычыцца гэта як дзяржаўных служачых, прадстаўнікоў сілавых структур, так і студэнтаў, усіх і кожнага. Марына Зуева сказала пра ролікі: «Гэта весела!» Але гэта яшчэ і здорава — ад слова «здароўе». Мы можам стаць краінай здаровых людзей. Для гэтага трэба заняцца сабой, выдзеліць час для трэніровак. Не дзеля кар'еры. Дзеля сябе. І сваіх дзяцей, для якіх мы прыклад.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.